**УДК 811.161.3'373.32(476.5)**

# ДЫНАМІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ МУЖЧЫНСКАЙ СІСТЭМЫ ІМЕНАВАННЯ У РЭГІЯНАЛЬНАЙ АНТРАПАНІМІІ[1]

***К.А. САСНОЎСКАЯ***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Разглядаюцца асаблівасці функцыянавання мужчынскіх уласных асабовых імён на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Матэрыялам для даследавання паслужылі спісы жыхароў Бешанковіцкага раёна, сабраныя на чатырох кантрольных зрэзах: канец XIX стагоддзя – 1917 год, 1920–1940 гады, 1950–1980 гады, 1990–2013 гады. Выяўлены асаблівасці функцыянавання мужчынскіх намінацый на кожным з чатырох храналагічных зрэзаў, праведзен іх этымалагічны аналіз. Прадстаўлен кампаратыўны аналіз колькасных паказчыкаў антрапанімікона Бешанковіцкага раёна ў параўнанні з паказчыкамі па Беларусі і Расіі. Робіцца вынік аб тым, што ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на фарміраванне мясцовага іменніка найбольшы ўплыў аказаў праваслаўны каляндар, узнікненне новых імён у 50–80-я гады XX стагоддзя звязана з перыядам савецкай эпохі. Галоўнай тэндэнцыяй сучаснага іменавання з'яўляецца працэс вяртання да імёнаў, якімі карысталіся ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя.*

**Уводзіны.** На сучасным этапе развіцця лінгвістыкі ўсё большую актуальнасць набываюць рэгіянальныя анамастычныя даследаванні, якія з'яўляюцца адбіткам культурна-гістарычных і этнаграфічных асаблівасцей жыцця народа. Імя – важны элемент свядомасці народа, асобны слой культуры. У працэсе называння адлюстроўваюцца духоўныя каштоўнасці народа, яго псіхалагічны, сацыяльны вопыт, што дазваляе выявіць спецыфіку ўласных імён асобнага рэгіёна. У апошні час рэгіянальныя даследаванні набываюць усё большую актуальнасць, паколькі мэтай дадзеных даследаванняў з'яўляецца вывучэнне ўплыву лінгвакультурнай прасторы на моўную свядомасць і ментальнасць носьбітаў мовы. Па словах Г.М. Мезенка, "Анамастыка Беларусі з'яўляецца аб'ектам асаблівай увагі не толькі лінгвістаў, але і гісторыкаў, этнографаў, фалькларыстаў. Тлумачыцца гэта тым, што ўласныя назвы – індывідуальныя найменні аб'ектаў – адносяцца да найбольш старажытнага лексічнага пласта моўнай сістэмы і адлюстроўваюць пэўныя культурна-гістарычныя і этнаграфічныя асаблівасці жыцця народа на розных этапах яго гісторыі" [1].

Актуалізацыя рэгіянальных анамастычных даследаванняў звязана з імёнамі У.А. Ніканава, В.В. Шура, М.Ю. Бяляевай, А.С. Шчарбак, І.А. Каралёвай, Г.М. Мезенка, Т.У. Скрабнёвай, В.М. Ляшкевіч, Т.А. Карніеўскай, Г.К. Семяньковай, якія займаліся вывучэннем асаблівасцей бытавання іменніка ў розных моўных сітуацыях, рэакцыяй антрапаніміі на разнастайныя грамадска-гістарычныя з'явы. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады цікавасць да рэгіянальных даследаванняў набывае папулярнасць, усё ж сучасныя анамастычныя матэрыялы даследаваны слаба.

**Матэрыялы і метады.** У якасці матэрыялу для даследавання былі абраны спісы жыхароў Бешанковіцкага раёна, сабраныя на чатырох храналагічных зрэзах: дакастрычніцкі – канец XIX – 1917 год (116 імён); паслякастрычніцкі – 1920–1940-я гады (164 імёны); пасляваенны – 1950–1980-я гады (73 імёны); постсавецкі – 1990–2013 гады (78 імён). Мужчынскі інвентар Бешанковіччыны за ўвесь даследаваны перыяд (к. XIX – п. XXI ст. ) налічвае 238 намінацый (8110 фіксацый).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У даследаваных крыніцах канца XIX – пачатку XX стагоддзя зарэгістравана 186 уласных імён (1006 фіксацый). Большую колькасць іменніка складаюць мужчынскія намінацыі – 62 % (116 імён – 521 фіксацыя). На сучасным этапе функцыянавання антрапонімаў на Бешанковіччыне сітуацыя адваротная: жаночыя імёны пераважаюць над мужчынскімі (56 і 44 % адпаведна) [2]. Малая колькасць жаночых антрапонімаў у XIX стагоддзі тлумачыцца адсутнасцю ў той час у жанчын юрыдычных правоў, а адсюль і фіксацый у афіцыйных дакументах. Колькасць зафіксаваных антрапонімаў на дадзеным прамежку часу амаль удвая меншая, чым агульны лік імён па Віцебскай губерні XIX стагоддзя – 227 мужчынскіх антрапонімаў [3]. Сярэдні каэфіцыент аднайменнасці (СКА – велічыня, роўная дзяленню агульнага ліку носьбітаў на колькасць зафіксаваных імён дадзенага перыяду) на даследуемай тэрыторыі складае 4,5. Аналіз выкарыстання дадзеных адзінак дазволіў вызначыць самыя папулярныя імёны гэтага перыяду: *Иван*[2] (44 носьбіты), *Василий* (41), *Симеон* (20), *Степан* (20), *Григорий* (17), Яков (17), *Федор* (16), *Павел* (12), *Андрей* (10), *Михаилъ* (10), *Кондратий* (9).

Прыведзены рад антрапанімных адзінак часткова супадае з мужчынскімі намінацыямі гараджан Віцебска XVI–XVIII стагоддзяў: імёны *Андрей, Василий, Григорий, Федор* сустракаюцца і на даследаванай тэрыторыі, і ў іменніку гараджан Віцебска. Цікавым з'яўляецца і супадзенне самага папулярнага імя на абедзвюх тэрыторыях – *Иван*. Вядома, што з XVIII стагоддзя да 1917 года імёны даваліся ў адпа-

---

[1] Работа выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД (праект № Г14М-103 ад 23.05.2014).
[2]Імёны падаюцца ў арфаграфіі даследаванай архіўнай крыніцы.

веднасці з іменем святога, якога ўшаноўвала царква ў дзень нараджэння дзіцяці ці на працягу тыдня. Супадзенне частотнасці выкарыстання імя *Иван* на тэрыторыі Бешанковіччыны і горада Віцебска можна патлумачыць яго частым ужываннем у царкоўным календары – 97 разоў на год [4, с. 4]. Аднаразовым выкарыстаннем у намінатыўнай практыцы Бешанковіцкага раёна канца XIX – пачатку XX стагоддзя характарызуюцца імёны: *Агафон, Адам, Аксенъ, Владимир, Войтехъ, Варфоломей, Георгий, Гурий, Денис, Евсевий, Леонарий, Малахъ, Никодим, Онуфрий, Прохоръ, Спиридонъ, Тит, Фаддей, Фокий, Харитон, Эдуард, Юрий.*

Мужчынская сістэма іменавання Бешанковіччыны канца XIX – пачатку XX стагоддзя характарызуецца вялікай разнастайнасцю і ўключае ў свой склад як кананічныя праваслаўныя і каталіцкія (96,6 %), так і старажытныя славянскія імёны (3,4 %). “Калі да X стагоддзя славянскія імёны былі адзіным сродкам ідэнтыфікацыі асобы, то пазней – у XV–XVIII стагоддзях – пры захаванні граматычнай структуры змяняюцца ўмовы надання іх, фунцыі і характар функцыянавання” [5, с. 4]. Як слушна заўважыў акадэмік М.В. Бірыла, пасля распаўсюджання хрысціянства з цягам часу славянскія імёны служылі для “другаснай” ідэнтыфікацыі асобы і з кожным стагоддзем усё радзей і радзей выкарыстоўваліся. На даследаванай тэрыторыі група славянскіх імён прадстаўлена чатырма намінацыямі: *Борис, Воддзя, Войтехъ, Владимир*. Нягледзячы на працэс выцяснення славянскіх антрапонімаў кананічнымі іменаваннямі ў той час, у бешанковіцкім інвентары імя *Борис* з’яўляецца частым і займае трынаццатую пазіцыю па ўжывальнасці.

Асноўную масу мужчынскага іменніка складаюць антрапонімы неславянскага паходжання, сярод якіх першае па колькасці месца займаюць намінацыі грэчаскай этымалогіі (56 % – 287 фіксацый): *Авсей, Агафон, Аксенъ, Анисим, Антонъ, Александр, Андрей, Алексей, Артемъ, Афанасий, Василий, Георгий, Григорий, Герасим, Дмитрий (Зимирий), Денис, Дорофей, Демьянъ, Демидъ, Дионисий, Евстафий, Евсевий, Евфими (Яхимъ), Емельян (Амельян), Ермолай, Евдоким (Авдокимъ), Исидор (Сидар, Изидор, Осидар), Кирилл, Киприян (Куприянъ), Кузьма, Кондратий, Карп, Лука (Лукаш), Леонарий, Макаръ, Мирон, Мина, Марк, Нестер (Нестор), Николай, Никифор, Никодимъ, Никита, Онуфрий, Прокоп, Порфирий, Парфенъ, Петр, Пахомъ, Прохоръ, Радивонъ, Созон, Спиридон, Севастьян, Сафонъ, Степан (Стефан), Трофимъ (Атрафимъ), Тарасий (Тарас), Тимофей, Федор (Федот, Феодор), Филлип, Фокий (Фока), Филлимон (Халимон), Харитон.*

Па словах П.М. Шпілеўскага, імя *Змитцеръ, Димитрий,* лічыцца “символом хитрости, и потому оно не въ большом ходу у белорусцевъ” [6, с. 29]. З такімі вынікамі даследчыка не стасуюцца нашы дадзеныя: у іменніку канца XIX – пачатку XX стагоддзя імя *Дзмітрый* сустракаецца даволі часта.

Другое месца належыць імёнам яўрэйскага паходжання – 24 % (158 фіксацый). Да самых ужывальных намінацый адносяцца імёны тыпу *Иван* (*Иоаннъ, Янка*), *Симеон* (*Семен, Сымон*), *Яков* (*Яковъ-Аполлинарий*).

На трэцім месцы – лацінскія імёны (14 %): *Венедикт, Викентий, Дементий, Игнатий, Константин, Корней, Лаврентий, Леонъ, Максим, Мартинъ, Павел* (самае папулярнае імя – 12 фіксацый), *Роман, Сергей, Титъ, Терентий, Юстинъ.*

Найменшую частку мужчынскага антрапанімікону (3 %) складаюць старажытнагерманскія намінацыі: *Людвигъ, Франц, Эдуард.*

Аналіз іменніка Бешанковіччыны канца XIX – пачатку XX стагоддзя дазваляе заўважыць, што ўжыванне некаторых антрапонімаў абмежавана тэрытарыяльна. Намінацыі тыпу *Агафон, Созон, Харитон* сустракаюцца толькі на тэрыторыі населенага пункта Ула.

Другі храналагічны зрэз закранае 20–40-я гады XX стагоддзя. Гэта час стварэння магутнай рэспублікі – СССР, якая абвясціла сябе свецкай дзяржавай і аддзялілася ад царквы (царква была пазбаўлена ўсялякіх юрыдычных правоў). У сувязі з рэвалюцыяй 1917 года пачалі набываць шырокае распаўсюджанне асобныя імёны, у прыватнасці імя *Уладзімір* (*Владімір, Владзімір, Владимир, Владзімер, Ладзімір, Уладзімер*), якое займае другое месца па ступені ўжывання (184 фіксацыі), і ўзнікаць новыя імёны (*Май, Электрон*). На другім храналічным зрэзе намі зафіксавана 164 намінацыі. Сярэдні каэфіцыент аднайменнасці больш чым у тры разы перавышае паказчык першага зрэзу і складае 16 адзінак. Самымі частымі па колькасці імяносьбітаў з’яўляюцца наступныя імёны: *Мікалай (277), Уладзімір (273), Іван (217), Васіль (178), Міхаіл (169), Петр (157), Аляксандр (121), Віктар (110), Анатоль (107), Леанід (66).*

Бесперапынна з канца XIX – пачатку XX стагоддзя да 1940 года функцыянуюць імёны *Іван, Васіль* і *Міхаіл* (на першых двух кантрольных зрэзах яны з’яўляюцца частымі). Да рэдкіх антрапонімаў адносяцца: *Аввакум, Альберт, Архіп, Вацлаў, Генрых, Гірша, Зеліх-Нафіта, Карпа, Лук’ян, Манеф, Пракоп, Прохар, Шміра, Юрый,* зафіксаваныя толькі аднаразова. Большасць з іменаванняў з’яўляюцца несапраўдны беларускімі. Этымалагічна гэтыя адзінкі ўзыходзяць да старажытнаяўрэйскіх, зрэдку грэчаскіх імён.

Адносна паходжання мужчынскіх намінацый на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна сітуацыя з папярэднім зрэзам не змянілася. Найбольшае распаўсюджанне атрымліваюць намінацыі грэчаскага паходжання – 43 %: *Агафон, Аўдакім, Васіль, Дзмітрый, Ігнацій, Карпа, Лаўрэн, Пракоп, Тарас, Ціхан, Яфім.* Дадзены зрэз яскрава і разнастайна прадстаўляюць імёны яўрэйскага паходжання (21,9 %): *Аввакум, Восіп, Гаўрыіл, Гурый, Двейра, Залман, Зеліх-Нафіта, Іон, Лазарь, Хава, Хаім, Хона, Шолом, Янкіль-Моўша.* Пералічаныя намінацыі часцей за ўсё сустракаюцца ў такіх населеных пунктах Бешанковіцкага раёна, як Бачэйкава, Бешанковічы і Ула. Па дадзеных Расійскай яўрэйскай энцыклапедыі, на тэрыторыі Бешанковічаў у 1923 годзе пражывала 1158 яўрэяў, у 1926 годзе – 1487 (55,3 %) [7]. Групу адзінак лацінскага паходжання (15,8 %) прадстаўляюць імёны *Альберт, Валянцін, Валяр’ян, Дементій, Клеменцій, Усцін,*

*Флорыан, Ціт*. Акрамя таго дадзены перыяд прадстаўлены намінацыямі славянскага (*Барыс, Баліслаў, Браніслаў, Вячаслаў, Казімір, Радомир, Уладзімір*), у тым ліку польскага (*Вацлаў, Станіслаў, Юзап*), старажытнагерманскага (*Вільхельм, Вітольд, Генрых, Франц*), стражытнаскандынаўскага (*Ігар*), індыйскага (*Ніл*), турэцкага (*Інкілап*), азербайджанскага (*Алі Ільяс Аглы*), арабскага (*Саід*) паходжання.

Трэці храналагічны зрэз уключае імёны 50–80-х гадоў ХХ стагоддзя, гэта час пасляваеннага перыяду, хрушчоўскай "адлігі", пакалення "шасцідзясятнікаў", працэс "новай хрысціянізацыі". Антрапанімікон дадзенага прамежку часу ў адрозненне ад двух папярэдніх перыядаў характарызуецца звужэннем рэпертуара (73 намінацыі) і павелічэннем СКА (43 адзінкі). Па колькасных паказчыках частымі з'яўляецца 21 адзінка: *Алег* (60 фіксацый), *Аляксандр* (425), *Аляксей* (105), *Анатоль* (133), *Андрэй* (103), *Валерый* (96), *Валянцін* (107), *Васіль* (153), *Віктар* (158), *Генадзь* (47), *Дзмітрый* (99), *Іван* (62), *Ігар* (76), *Леанід* (72), *Мікалай* (237), *Міхаіл* (109), *Петр* (48), *Сяргей* (312), *Уладзімір* (223), *Юрый* (84), *Яўген* (57). Антрапонім *Сяргей* у параўнанні з 20–40-мі гадамі ўваходзіць у спіс частотных імён і займае другое месца па ўжывальнасці. Да яго ж далучаюцца *Валянцін* і *Аляксей*. Прыведзены рад амаль цалкам супадае з дадзенымі частотнасці імён на Смаленшчыне [8, с. 170]. Пры гэтым тройка намінацый па папулярнасці (*Аляксандр, Сяргей, Уладзімір*) адна і тая ж на тэрыторыі рускіх усходніх гарадоў – Калуга, Кастрама, Тамбоў [8, с. 170].

У іменніку адзначанага прамежку часу адбыліся значныя змены: імя *Іван*, якое на працягу паўстагоддзя было папулярным, зараз займае толькі 17-е месца па частаце выкарыстання; *Аляксандр* і *Сяргей*, якія ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя кваліфікаваліся як рэдкія, зараз займаюць лідзіруючыя пазіцыі. У адрозненне ад папярэдняга кантрольнага зрэзу, на гэтым прамежку часу імён яўрэйскага паходжання назіраецца вельмі мала, што найперш тлумачыцца дзеяннямі фашыстаў ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Напярэдадні вайны колькасць яўрэяў у Бешанковічах значна ўзрасла (2800 чалавек) за кошт тых, хто ўцякаў з акупіраванай Польшчы. У 1941 годзе нацысты стварылі гета, дзе было забіта каля 2900 яўрэяў. Усяго ж нямецкія акупанты знішчылі ў Бешанковіцкім раёне 10 276 чалавек [9].

У перыяд 50–80-х гадоў ХХ стагоддзя дыяпазон уласных асабовых імён значна пашыраецца. Новыя запазычанні трапляюць у мужчынскую імянную сістэму з арабскай, армянскай, сербскай, татарскай моў: *Аруцюн, Асіф, Марат, Фаніль, Фаніс*. З'яўленне такіх намінацый тлумачыцца перш за ўсё нацыянальнай прыналженасцю бацькоў, якія давалі імёны сваім дзецям. Увогуле ж найбольш распаўсюджаны ў гэты час імёны, якія ўзыходзяць да грэчаскай (41 %), лацінскай (15 %), старажытнаславянскай (11 %), старажытнаяўрэйскай (10 %) і старажытнагерманскай (4,2%) этымалогіі.

Развіццё мужчынскай антрапанімнай сістэмы на чацвёртым храналагічным зрэзе (постсавецкі перыяд (1990–2013) характарызуецца нізкай канцэнтрацыяй імён і па паказчыках СКА (16,5 адзінак) набліжаецца да паслякастрычніцкага перыяду (16 адзінак). На суседняй Смаленшчыне за 1998 год узровень канцэнтрацыі іменніка значна вышэйшы і дасягае 25 адзінак [8, с. 186]. Іменнік Бешанковіччыны за апошнія 23 гады павялічыўся на пяць адзінак у параўнанні з папярэднім зрэзам – 78 антрапонімаў. На долю частых імён прыходзіцца 36 %: *Аляксандр* (110 фіксацый), *Дзмітрый* (100), *Сяргей* (66), *Аляксей* (65), *Яўген* (64), *Уладзіслаў* (53), *Андрэй* (48), *Мікіта* (46), *Іван, Кірыл* (усе па 43), *Антон, Арцем, Максім* (усе па 38), *Раман, Уладзімір* (усе па 29), *Дзяніс, Павел* (усе па 27), *Канстанцін* (26), *Вадзім* (25), *Ігар, Мікалай, Ягор* (усе па 24), *Станіслаў* (23), *Віталь, Міхаіл* (усе па 22), *Віктар, Юрый* (усе па 19). У спіс рэдкіх трапляе папулярнае ў 20–40-я гады імя *Аркадзь* і частыя *Алесь, Захар, Ігнат*. Як ні дзіўна, у 2005 годзе зарэгістравана імя *Владлен* (скарачэнне ад *Влад*имир *Лен*ин), мала запатрабаванае ў наш час. Чым кіраваліся бацькі пры наданні дзіцяці такога імя, невядома: ці прыхільнасцю да асобы вялікага правадыра, ці мілагучнасцю дадзенага імя.

Спіс сучасных мінскіх імён за 2013 год не вельмі адрозніваецца ад рэестру іменаванняў Бешанковіччыны постсавецкага перыяду. Так, па дадзеных запісаў архіва органаў загс самае папулярнае імя ў мінчан – *Максім* (463 фіксацыі). Дзясятак мужчынскіх антрапонімаў горада Мінска на палову супадае па папулярнасці з іменаваннямі Бешанковіцкага раёна: *Аляксандр, Аляксей, Іван, Мікіта, Уладзіслаў* [10].

Што да складу імён з боку этымалогіі, то на дадзеным прамежку часу пераважную большасць займаюць грэчаскія намінацыі (40 %): *Алесь, Арсеній, Архіп, Генадзь, Сцяпан, Цімафей, Ягор, Яўген*. У параўнанні з іменаваннямі 1950–1980-х гадоў лацінскія імёны саступаюць месца старажытнаяўрэйскім – 15 %: *Ілья, Давід, Данііл, Елізар* (упершыню імя зафіксавана толькі ў 1990–2013 гадах), *Мацвей, Сямён*. Этымалагічна дыяпазон антрапонімаў пашыраецца за кошт арабскіх (*Амір, Шадэн*), армянскіх (*Самвел*), новых (*Владлен*), славянскіх (*Мечыслаў, Станіслаў, Ярамір*), старажытнагерманскіх (*Генрых, Эдуард*) і старажытнарускіх (*Багдан, Валадар, Расціслаў*) найменняў.

У выніку даследавання мужчынскага іменніка на чатырох храналагічных зрэзах выяўлена, што на фарміраванне мясцовага антрапанімікону найбольш моцны ўплыў аказаў праваслаўны каляндар. Рэестр папулярных імён канца ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя часткова супадае з мужчынскімі намінацыямі гараджан Віцебска XVI–XVIII стагоддзяў. Другі храналагічны зрэз характарызуецца павелічэннем СКА ў тры разы і ўстойлівым функцыянаваннем імён *Васіль, Іван, Міхаіл* на працягу двух храналагічных зрэзаў. У постсавецкі перыяд (1990–2013) назіраецца працэс вяртання імён, якія ўжываліся ў канцы ХІХ стагоддзя – 1917 годзе: *Захар, Прохар, Радзіон, Расціслаў*. Бесперапынна на працягу канца ХІХ – пачатку ХХІ стагоддзя ўжываюцца імёны *Аляксандр, Віктар, Мікалай, Міхаіл, Уладзімір, Цімафей*.

**Заключэнне.** Кожны з чатырох даследаваных храналагічных зрэзаў мае свае спецыфічныя асаблівасці. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя працэс намінацыі адбываўся ў асноўным па царкоўным календары. Папулярнасць імя залежыла ад частаты яго ўжывання ў святках. Нягледзячы на той факт, што пасля XV–XVIII стагоддзяў кананічныя імёны пачалі выцясняць славянскія, на даследаванай тэрыторыі ў дакастрычніцкі перыяд такія намінацыі адносяцца да частых. На мужчынскую імянную сістэму перыяду 1950–1980-х гадоў значны ўплыў аказала ўзнікненне новай савецкай ідэалогіі ў грамадстве. У сувязі з гэтым узнікаюць новыя імёны (*Май, Электрон*) і выходзіць з ужытку большасць іменаванняў яўрэйскай этымалогіі. Іменнік мужчын у постсавецкі перыяд характарызуецца вяртаннем старых кананічных імён (*Данііл, Елізар*) і старажытнарускіх (*Багдан, Валадар, Расціслаў*). Найбольшай канцэнтрацыі дасягае іменнік у постсавецкі перыяд, дзе СКА роўны 43 адзінкам, а найменшай – у дакастрычніцкі (СКА – 4,5 адзінкі). Ужыванне некаторых мужчынскіх антрапонімаў абмежавана тэрытарыяльна. Імёны *Агафон, Созон, Харитон* зафіксаваны толькі на тэрыторыі г.п. Ула. Іменаванні яўрэйскага паходжання часцей сустракаюцца на тэрыторыі Бешанковіч, Улы і вёскі Бачэйкава. З боку этымалогіі на ўсіх чатырох кантрольных зрэзах пераважаюць іменаванні, запазычаныя з грэчаскай мовы. На апошніх двух кантрольных зрэзах дыяпазон антрапонімаў пашыраецца за кошт арабскіх, армянскіх, індыйскіх, сербскіх, татарскіх, турэцкіх, цюркскіх найменняў. Усё гэта сведчыць аб тым, што антрапанімікон з'яўляецца яскравым адлюстраваннем тых сацыяльна-гістарычных змен, якія адбыліся ў грамадстве на працягу адзначанага часу.

ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская антрапанімія: вучэб. дапамож. / Г.М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2009. – 254 с.
2. Сасноўская, К.А. Асаблівасці сучаснага антрапанімікону Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці / К.А. Сасноўская // Русская литература и методика ее преподавания в современном поликультурном пространстве: автор – жанр – стиль: сб. материалов междунар. науч.-практ. конф., Брест, 4–5 окт. 2012 г.: в 2 ч. Ч. 1 / Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина; редкол.: Т.В. Сенькевич (гл. ред.), О.Б. Переход. – Брест: БрГУ, 2012. – С. 177–179.
3. Скребнева, Т.В. Антропонимикон современного белорусского города в динамическом и социолингвистическом аспектах (на материале русскоязычных личных имен г. Витебска): автореф. дис. … канд. филол. наук, (10.02.02) / Т.В. Скребнева. – Минск, 2010. – 23 с.
4. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць: манагр. / Г.М. Мезенка, В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2006. – 238 с.
5. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія 3: Структура ўласных мужчынскіх імён / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 320 с.
6. Прыгодзіч, М.Р. "Списокъ именъ мужескихъ и женскихъ, несходныхъ съ именами русскаго языка" (1845) П. Шпілеўскага ў гісторыі беларускай анамастыкі / М.Р. Прыгодзіч, А.А. Прыгодзіч // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г.; Ін-т мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – С. 29.
7. Российская еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – 2014 – Режим доступа: http://rujen.ru/index.php. – Дата доступа: 10.01.2014.
8. Королева, И.А. Имена на Смоленщине: история и современность: учеб. пособие по спецкурсам "Русская антропонимика", "Имена смолян: прошлое, настоящее, будущее" / И.А. Королева, И.В. Данилова, А.Н. Соловьев. – Смоленск: СГПУ, 2005. – 196 с.
9. [Электронный ресурс]. – 2014 – Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki/Бешенковичи. – Дата доступа: 06.03.2014.
10. [Электронный ресурс]. – 2014 – Режим доступа: http://news.tut.by/society/378744.html. – Дата доступа: 14.12.2013.


*Поступіў 16.09.2014*

**DYNAMIC PROCESSES SYSTEM OF MALE NAMING IN THE REGIONAL ANTHROPONIMY**

***E. SOSNOVSKAYA***

*The article is devoted to revealing of peculiarities of functioning of the male personal names in the territory of the Beshenkovichi district, Vitebsk region. The research material was the lists of residents for Beshenkovichi district, collected on four test sections: the end of XIX century – 1917, 1920 –1940, 1950 – 1980, 1990–2013. Identify features of functioning of the male nominations each time slice, is their etymological analysis. Is carried out comparative analysis of quantitative indicators of anthroponymical Beshenkovichi district with the figures for Belarus and Russia. The article concludes that, in XIX–XX century on the formation of local anthroponymical had the greatest impact Orthodox calendar. The emergence of new names in the 50–80-ies of the XX century is associated with the period of the Soviet era. The main tendency of modern naming – return to the names used in XIX–XX century.*